ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 38 (674) | Аўторак, 29 снежня 1987 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




## ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

На фінішы — 1987 год. У жыцці нашай краіны, усяго савецкага народа ён быў вельмі насычаны на падзеі гістарычнага значэння. Усе нашы намаганні былі накіраваны на паспяховае ажыццяўленне рашэнняў XXVII з'езда партыі, студзеньскага, чэрвеньскага і кастрычніцкага (1987 г.) Пленумаў ЦК КПСС. Паўсюдна шырокі размах набыла барацьба за паспяховае ажыццяўленне перабудовы ва ўсіх сферах эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага і культурнага жыцця, курс на якую ўказаў красавіцкі (1985 г.) Пленум ЦК КПСС, а таксама ў ажыццяўленні Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. За гэты год удалося дасягнуць многага, аб чым засведчыла падрыхтоўка і святкаванне слаўнага 70-годдзя Вялікага Кастрычніка. Зроблены першыя крокі і на шляху перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. У яе аснову таксама пакладзены прынцыпы сапраўднага дэмакратызму, галоснасці, шырокага ўкаранення самакіравання.

Надыходзячаму Новаму году папярэднічае яшчэ адзін юбілей. Заўтра савецкія людзі адзначаць 65-годдзе ўтварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. СССР прадэманстраваў усяму свету перавагі сацыялістычнага ладу жыцця, сваю знешнюю міралюбівую палітыку. У гэтым сэнсе выключнай падзеяй з'явілася нядаўняе падпісанне савецка-амерыканскага Дагавора аб ліквідацыі ракет сярэдняй і меншай дальнасці. Гэты дакумент гістарычнага значэння з'яўляецца першым на складаным шляху да ўсеагульнага раззбраення.

У новы 1988 год краіна вялікага У. І. Леніна ўваходзіць з яшчэ большымі, гіганцкімі па сваіх маштабах задачамі. Па-сутнасці пачынаецца другі этап перабудовы. Ад вынікаў яго пераадолення залежаць усе наступныя нашы дасягненні камуністычнага будаўніцтва.

Новы 1988 год таксама азнамянуецца важнымі падзеямі ў жыцці нашай сацыялістычнай Радзімы, Камуністычнай партыі, савецкага народа. На прадстаячым Пленуме ЦК КПСС будзе ўсебакова абмеркаваны стан народнай адукацыі ў краіне, што дазволіць паставіць на больш высокі ўзровень навучанне падрастаючага пакалення, падрыхтоўку спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі ў сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай школе, палепшыць камуністычнае выхаванне моладзі.

З неаслабнай увагай у канцы чэрвеня мы будзем сачыць за работай XIX Усесаюзнай партыйнай канферэнцыі. Яна разгледзіць ход рэалізацыі рашэнняў XXVII з'езда партыі, асноўныя вынікі першай палавіны XII пяцігодкі і задачы партарганізацый па паглыбленню працэсу перабудовы, меры па далейшай дэмакратызацыі жыцця партыі і грамадства.

Узрастаючыя патрабаванні, новыя ўмовы часу павінны аказаць істотны мабілізуючы ўплыў і на ўвесь калектыў нашага універсітэта. Прадстаіць многае зрабіць у напрамку карэннага паляпшэння падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. Прэстыж ГДУ становіцца ў прамую залежнасць ад заказаў на яго выпускнікоў. І каб гэты попыт быў вялікім, ішлі станоўчыя водзывы на падрыхтаваных у ГДУ спецыялістаў, трэба паўсядзённа праяўляць ініцыятыву і творчасць у перабудове работы факультэтаў, кафедр, усіх структурных падраздзяленняў. Не менш важным з'яўляецца тое, каб усе студэнты праніклiся глыбокай адказнасцю за свае прафесіянальныя веды. Пасрэдны студэнт — гэта слабы спецыяліст, і яго не пажадаюць мець у вытворчым калектыве, дзе ўкаранёны поўны гаспадарчы разлік, самаакупнасць і самафінансаванне, дзе ад кожнага работніка патрабуецца максімальная аддача ведаў і энергіі.

У надыходзячым годзе будаўнікі павінны здаць у эксплуатацыю новы корпус фізічнага факультэта. Дадатковыя вучэбныя плошчы, аснашчэнне іх сучасным навуковым абсталяваннем, большая патрабавальнасць да арганізацыі вучэбна-выхаваўчага і навукова-даследчага працэсу, іх вынікаў адыграюць важную ролю ў далейшым станаўленні нашага універсітэта як вядучай вышэйшай навучальнай установы Беларускага Палесся.

1988 год — год зімовых і летніх Алімпійскіх гульняў. Для нас стане гонарам, калі мы зможам дасягнуць новых поспехаў у далейшым развіцці фізкультурна-масавай работы, дабіцца павышэння майстэрства сваіх вядучых спартсменаў, каб сярод іх выявіліся кандыдаты для ўдзелу ў гэтых буйнейшых сусветных спаборніцтвах.

На новыя, больш значныя поспехі мы разлічваем у патрыятычным руху студэнцкіх атрадаў, у дзейнасці клуба мастацкай самадзейнасці «Маладосць», розных аматарскіх аб'яднанняў.

Усе мы азнаёміліся з тэкстам пісьма «Умацоўваць перабудову справамі», з якім Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі звярнуўся да камуністаў, усіх працоўных рэспублікі. «Цэнтральны Камітэт Камуністычнай партыі Беларусі заклікае ўсіх камуністаў, камсамольцаў і беспартыйных, дзе б яны ні працавалі, — ля станка або на канвееры, за рулём трактара або на жывёлагадоўчай ферме, на будоўлі або ў сферы абслугоўвання, у навуковай лабараторыі або вучэбнай аўдыторыі — стаць у рады актыўных байцоў перабудовы, умацоўваць яе практычнымі справамі». Гэтыя словы — арыенцір для нашага дзеяння.

Горача віншуем Вас, дарагія таварышы, з Новым, 1988 годам! Шчасця, моцнага здароўя, вялікіх Вам поспехаў у працы, вучобе і грамадскай дзейнасці на карысць нашай сацыялістычнай Айчыны!

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, ПРАФКОМ,
КАМІТЭТ ЛКСМБ, ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.

## С НОВЫМ СЧАСТЬЕМ!

...Новогодней полночью седою,
Стременем серебряным звеня,
Старый всадник с белой бородою
Слез в пути с крылатого коня.
Посмотрел на все моря и земли,
Улыбнулся тихо и светло.
В этот самый миг его преемник
Быстро сел в походное седло.
И когда в дали голубоватой
Всадники, как братья обнялись,
Словно на вершине диферблата,
Стрелки на двенадцати сошлись.
...Бой часов плывет под небосводом.
В окнах свет не гасят города.
«Дорогие люди, с Новым Годом!
Будьте в жизни счастливы всегда!..»

Р. ГАМЗАТОВ.

## ЗАПРАШАЮЦЬ ДЗЕД МАРОЗ І СНЯГУРАЧКА

30-га снежня — выкладчыкаў і супрацоўнікаў на Навагодні вечар, які пачнецца ў 19 гадзін у першым вучэбным корпусе. Уваход па запрашальных білетах. 2-га студзеня — дзяцей выкладчыкаў, супрацоўнікаў ГДУ на святочны ранішнік каля навагодняй прыгажуні-ёлкі ў фае актавай залы вучэбнага корпуса № 1. Пачатак — у 10 гадзін.

## ВУЧОБА ПАРТАКТЫВУ

На мінулым тыдні адбыліся чарговыя заняткі на семінары партыйнага актыву універсітэта. Абмеркаваны пытанні арганізацыйна-партыйнай і ідэалагічнай работы па рэалізацыі Асноўных напрамкаў перабудовы вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Выступілі сакратар парткома М. І. Старавойтаў, сакратары пярвічных партыйных арганізацый: Л. Я. Палякоў — з матэматычнага, Т. П. Жалонкіна — з фізічнага, Ж. А. Герасімава — з геалагічнага, Т. В. Карпей — з эканамічнага факультэтаў, намеснік сакратара партарганізацыі факультэта фізвыхавання І. Р. Трафімовіч.

У рабоце семінара прыняла ўдзел і выступіла першы сакратар Цэнтральнага РК КПБ Г. М. Кускова.

## РАСЦЕ НАВУКОВЫ ПАТЭНЦЫЯЛ

Гэтымі днямі на матэматычным факультэце горача віншавалі выпускніка матфака і мэтавай аспірантуры асістэнта кафедры тэорыі імавернасцей і матэматычнай статыстыкі І. І. Хамічкова з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук. Такім чынам, выкананы сацыялістычныя абавязацельствы універсітэта ў юбілейным годзе па падрыхтоўцы навуковых кадраў. Сёлета абаронены доктарскія дысертацыі загадчыкамі кафедр біялагічнага факультэта А. І. Кіенем і Л. М. Сапегіным, якім ВАК прысудзіў ужо вучоныя ступені доктараў біялагічных навук, і 14 кандыдацкіх дысертацый па фізіка-матэматычных, філалагічных, эканамічных і грамадскіх навуках.

# ПЕРАДНАВАГОДНЯЯ ДОШКА АБ'ЯЎ

### АДКРЫВАЕЦЦА СТУДЭНЦКІ КААПЕРАТЫЎ

Кааператары прапаноўваюць такія віды паслуг, як напісанне ўсемагчымых шпаргалак па розных прадметах, фотакопіі справаздач і курсавых работ. Членамі кааператыва выконваюцца разнастайныя чарцяжы, табліцы і іншыя афарміцельскія работы. За адпаведную ўзнагароду гатовы зрабіць нават дыпломны праект. Якасць гарантуецца.

За выкрыццё падлогу выкладчыкамі кааператыў адказнасці не нясе.

* * *

Таго, хто знайшоў згублены латарэйны білет № 0023456 серыі 789, просяць праверыць. Хаця, наўрад ці....

* * *

Пушчу на кватэру музу. Магчыма аплата наперад.

* * *

Мяняю выйграўшы білет латарэі ДТСААФ на білет № 21 па матэматычнаму аналізу на экзамене.

### УВАГА: ПОШУК

Шукаем: філасофскі камень, соль зямлі, залежы брыльянтаў, скарбы фараона Тутантхамона. Пошукі праводзяцца на будаўнічай пляцоўцы побач з галоўным корпусам універсітэта.

Жадаючыя могуць прыняць удзел.

### ЗВАРОТ

Работнікі грамадскага харчавання! Давайце есці разам!

### КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ

Не вучыце мяне жыць, лепш дапамажыце мне матэрыяльна.

(З заявы на матэрыяльную дапамогу).

* * *

Трымай кішэню шырэй!

(З моўнага лексікону касіраў).

### ПЫТАННЕ РУБАМ

— Чаму ты ў слове «поваренный» напісаў адно «н»?

— Дык гэта ж канспект, тут скарочана трэба пісаць!

### МУЗЕЙНАЯ РЭДКАСЦЬ

Прафесар звяртаецца да аўдыторыі.

— Перад вамі чэрап шымпанзэ вельмі рэдкай пароды. Такіх чарапоў у нашай краіне ўсяго два: адзін у нацыянальным музеі, другі — у мяне.

### ВЕЛЬМІ ПРОСТА

Адзін прафесар скардзіўся свайму таварышу па службе, спецыялісту па старажытнай гісторыі:

— Уявіце сабе, што я не ў стане запомніць год нараджэння не толькі сваіх дзяцей, але нават свой асабісты.

— Няма нічога прасцей, калега. Трэба гэтыя даты «прычапляць» да дня нараджэння якога-небудзь славутага чалавека. Вось чаму я вельмі добра памятаю, што сам асабіста нарадзіўся праз 2369 гадоў пасля Сакрата, мая жонка — праз 1857 пасля смерці Ціберыя, наш сын — праз 2067 гадоў пасля таго, як Гракх патрабаваў аднаўлення Ліцыніевых законаў, а наша дачка нарадзілася праз 1564 гады пасля перасялення гарадоў.

Бачыце, калега, як усё проста.

(Перадпавагоднія жарты даслаў у рэдакцыю Дзед Мароз з розных ВНУ краіны).



ЯК У КАЗЦЫ. Фота Т. Лукоўскай.

## НОВЫЙ ГОД

Мчит нас время,
С ног сшибая,
Льется дней водоворот,
Мы порой не замечаем,
Где же самый Новый год.
Скоро ль и в каком наряде
Снежной ночью он придет,
Как узнать, в глаза не глядя,
Что с собою он несет?
Распознать его воочью
С первой встречи не трудись,
А последней зимней ночью
На прощанье оглянись.
Только в вечность провожая
Уходящие года,
Их совсем не замечая,
Нам взгрустнется иногда.
Самым Новым годом будет
Тот, что счастье принесет,
Если вас друзья полюбят,
Если сердце запоет.
Если будет мир планете,
Если очень повезет,
Если улыбнутся дети —
Это самый Новый год.

Т. ЛУКОВСКАЯ.

## ПАД ЗНАКАМ ДРАКОНА

Каляндар, прыняты ў многіх краінах Усходу, мае 12-гадовы цыкл, і кожны год праходзіць пад знакам адной з жывёл. Надыходзячы 1988-ы — год Дракона. Не будзем палохацца, успамінаючы глыбокую старажытнасць і міфалогію. Гэты Дракон зусім не страшны. Яго, як сімвал Новага года, можна павесіць на сцяну, на ёлцы побач з Дзедам Марозам ці падарыць сябру, калі той нарадзіўся менавіта ў год Дракона.

БЕЗ СЛОЎ...



# СВЯТА ВЯСЁЛАЕ І СУР'ЁЗНАЕ

МАЗАІКА

Напэўна, ні ў адно свята не праяўляюцца так ярка характар народа, яго звычаі і традыцыі, як у святкаванні Новага года.

У японцаў, напрыклад, здаўна павялося, што ў навагоднюю поўнач званы храмаў у гарадах і сёлах адбіваюць 108 удараў. Б'юць па званах цяжкім бервяном, якое падвешваюць гарызантальна на двух канатах. Бервяно раскачваюць, а затым рыўком стукаюць па звану. Звон, які раздаецца, трансліруецца па радыё. Лічба 108 з'явілася не выпадкова. Японцы лічаць, што ў чалавека бывае шэсць заган: скваплівасць, злосць, глупства, лёгкадумнасць, нерашучасць і прагнасць. Кожная з іх мае 18 розных адценняў. Калі звоніць звон, адбываецца паступовае ачышчэнне ад заган. З апошнім ударам трэба класціся спаць, каб устаць на світанні, выйсці на вуліцу і сустрэць Новы год з першымі промнямі ўзыходзячага сонца. Раніцай вуліцы становяцца дзіўна ўпрыгожанымі. Да свята ва ўсіх сем'ях робяць папяровых змеяў розных памераў, ярка расфарбоўваюць іх і ў дзень Новага года запускаюць у неба.

* * *

У Індыі прынята: у дзень Новага года ніхто не павінен быць злым, раздражнёным або сярдзітым. Лічаць, як пройдзе першы дзень года, такім і ўвесь год будзе. Індыйцы запэўніваюць, што той будзе шчаслівы, хто ўстане рана, умыецца, паразважае, нагадае мінулы год і падумае аб планах на будучае.

* * *

В'етнамцы ў навагоднюю ноч дораць адзін аднаму галінку персікавага дрэва. Сем'і разам з сябрамі доўга сядзяць каля кастра і расказваюць казкі, цікавыя гісторыі.

* * *

У італьянцаў ёсць цікавы звычай: у навагоднюю ноч выкідваць са сваіх кватэр і дамоў непатрэбныя рэчы. Італьянцы ў апошнія мінуты адыходзячага года стараюцца ні з кім не сварыцца, не пазычаць грошы і абавязкова закончыць усе справы.

* * *

Вельмі своеасабліва праводзяць стары год служачыя многіх устаноў аргенцінскай сталіцы: згодна даўняй традыцыі яны выкідваюць з вокнаў старыя настольныя перакідныя календары, непатрэбныя ведамасці, загады, бланкі, цыркуляры, пастановы. Вуліцы ў цэнтры Буэнас-Айрэса пакрываюцца тоўстым слоем паперы. Ніхто не ведае, як і калі ўзнікла гэтая традыцыя, але затое тут нярэдка ўспамінаюць розныя казусныя здарэнні, якія адбываліся ў дзень провадаў старога года. Так, напрыклад, супрацоўнікі адной з газет перастараліся і выкінулі ў акно амаль увесь архіў.

* * *

У Шатландыі ў дзень провадаў старога і сустрэчы Новага года адкрыты дзверы ўсіх дамоў: кожны можа зайсці ў госці ў любую сям'ю. Госцю належыць прынесці з сабой кавалачак вугалю, кінуць яго ў сямейны камін і пажадаць, каб агонь у гэтым доме гарэў доўга-доўга.

* * *

На Кубе да поўначы напаўняюць збаны вадой. Як толькі стрэлка гадзінніка спыняецца на лічбе 12, ваду выліваюць на зямлю. Лічыцца, што са старым годам развіталіся. А затым пачынаюцца навагоднія карнавалы з факельнымі шэсцямі і феерверкамі, песнямі і танцамі.

* * *

У англічан вельмі важнай персонай лічыцца «першая нага» у Новым годзе: у гэтай якасці перавага аддаецца цёмнавалосаму мужчыну. Ён павінен з'явіцца з кавалачкам вугалю і галінкамі сасны ў руках, яго сустракаюць вельмі шумна.

* * *

У Лаосе напярэдадні Новага года цэлы тыдзень праводзяцца фестывалі вады: жыхары, якія пакутуюць ад спякоты, абліваюць адзін аднаго вадой са шлангаў, вадзяных пісталетаў, збаноў і вёдраў.

* * *

Новы год найбольш папулярнае і любімае свята і ў савецкіх людзей. Да яго таксама рыхтуюцца загадзя: купляюць ёлку, цацкі, думаюць аб падарунках, гульнях. Для ажыўлення свята праводзяцца латарэі, разыгрываюцца прызы на лепшае выкананне танцаў, песень. У якасці прызоў пераможцам уручаюцца сувеніры, падрыхтаваныя загадзя. Яны могуць быць недарагімі, але з фантазіяй. Рыхтуюцца навагоднія падарункі ад Дзеда Мароза, якія кладуць пад ёлку або на святочны стол, жартаўлівыя віншавальныя пісьмы, граматы, паштоўкі. І, канешне, не абыходзіцца без вясёлага карнавалу!

Новы год — вясёлае, свята ва ўсіх народаў Зямлі. І ва ўсіх краінах простыя людзі звязваюць з Новым годам свае надзеі на мір, на шчасце, на светлую будучыню.



ЗІМНЯЯ МУЗЫКА.
Фота А. Ульянкінай.

## Усмешкі мастака



Дзед Мароз:
— Можа цяпер і на Алімпійскія гульні ў Калгары трапім?

## БЮРО ДАВЕДАК ДЗЕДА МАРОЗА

● Новы год сустракаць студэнтам трэба весела, але не забываць, што «на носе» — зімовая сесія.

● Хвост, атрыманы на экзамене, і не адсечаны ва ўстаноўлены тэрмін, пацягне студэнта за парог універсітэта.

● Калі сесію здасі на «здавальняюча», забудзь на паўгода слова «стыпендыя».

Рэдактар Ул. БАЛОГА.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 3-11, тэл. 57-16-52.

«Гомельскі універсітэт» — орган парткома, рэктората, профсоюзных комитетов, комитета ЛКСМБ Гомельского государственного университета. Гомельская фабрика «Палесдрук» Дзяржкамітэта БССР па справах выдавецтваў, паліграфіі і кніжнага гандлю. Гомель, Савецкая, 1.

АЗ 44804
Аб'ём — 1 друк. арк.
Тыраж 2000 экз. Заказ 977.